Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Ананіцкі навучальна-педагагічны комплекс
дзіцячы сад-сярэдняя школа”

Забава ў рознаўзроставай групе

# **“Жыву ў Беларусі і тым ганаруся”**

з дзецьмі ад 5 да 6 гадоў

Падрыхтавала:
выхавальнік дашкольнай
адукацыі Н.І.Пыж

2021/2022

**Тэма: “Жыву ў Беларусі і тым ганаруся”**

Задачы: развіваць патрэбнасць у пазнанні сацыяльнай рэчаіснасці, цікавасць да роднага краю; фарміраваць уяўленні пра дзяржаву і дзяржаўныя сімвалы; выхоўваць пачуццё нацыянальнага гонару, любоў да Радзімы.

Матэрыял: аўдыёзапіс Дзяржаўнага гімна Беларусі, лісты з выявай Дзяржаўнага сцяга і герба Рэспублікі Беларусь, лісты-размалёўкі, фішкі для ўзнагароджвання.

-Дзеці, як вы разумееце слова “Радзіма”? *(Родны край; месца, дзе мы нарадзіліся; краіна, дзе мы жывём)*

Выхавальнік чытае дзецям верш А.Вольскага **“Радзіма”.**

Радзіма ў нас бязмежная,

спякотная і снежная.

Радзіма ў нас цудоўная,

Багаццяў розных поўная.

Радзіма ў нас магутная,

Ва ўсім Сусвеце чутная.

Радзіма ў нас лагодная,

Нібы матуля родная.

А самае галоўнае:

Усе ёй дзеці — роўныя.

Выхавальнік паказвае дзецям дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь.

-Раскажыце пра дзяржаўныя сімвалы нашай краіны – Дзяржаўны герб і дзяржаўны сцяг. Выхавальнік уключае дзецям аудыёзапіс Дзржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь.

-Як называецца музыка, якая гучыць? Калі выконваецца гімн Рэспублікі Беларусь? Што трэба рабіць, калі гучыць Дзяржаўны гімн? *(Трэба ўстаць і слухаць стоячы і моўчкі, хлопчыкам здымаць галаўныя ўборы – такім чынам мы праяўляем павагу да сваёй краіны).*

-Што вы бачыце на малюнку? *(Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Буларусь)* Расфарбууце Дзяржаўны сцяг нашай краіны.

Беларуская народная гульня **“Лянок”**

Выбіраецца вядучы. На падлозе раскладваюцца абручы – гнёзды, колькасць якіх на два-тры меншая за колькасць іграkoў. Усе становяцца ў кола, бяруцца за рукі. Вядучы ў цэнтры кола робіць розныя рухі, усе паўтараюць іх. Па камандзе “Садзі лён!” іграki займаюць гнёзды, а той, хто не зойме месца, лічыцца “Пасджаным”: яго садзяць у гняздо да канца гульні. Перамагае той, хто зойме апошняе свабоднае гняздо.

*Віктарына* **“Мая Радзіма – Рэспубліка Беларусь”**

Выхавальнік размяркоўвае дзяцей на дзве каманды і кожнай камандзе па чарзе задае пытанні. За кожны правільны адказ камандзе налічваецца адзін бал. Каманда, якая набярэ большую колькасць балаў, з’яўляецца пераможцай.

1. Якія дзяржаўныя сімвалы ёсць у кожнай краіны? *(Дзяржаўны сцяг, Дзяржаўныгерб, Дзяржаўны гімн).*
2. Якімі раслінамі пераплецены каласы на Дзяржаўным гербе Рэспублікі Беларусь? *(З аднаго боку – ружовымі кветкамі канюшыны, з другога – блакітнымі кветкамі лёну).*
3. Дзе можна ўбачыць выяву Дзяржаўнага герба? *(На пячатках, пашпартах, грашовых знаках, дакументах).*
4. Колькі колераў мае Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь? (Тры колеры: чырвоны, зялёны, белы).
5. Што такое Дзяржаўны гімн? (Урачыстая песня, якая сімвалізуе дзяржаўнае адзінства).
6. Што азначае на Дзяржаўным сцягу Рэспублікі Беларусь зялёны колер? (Колер прыроды, сімвал дабра, росту, дабрабыту і міру).

-Намалюйце па кропках прыродныя сімвалы Рэспублікі Беларусь і расфарбуйце яго.

Гульня **“Мазаіка”**

Выхавальнік размяркоўвае дзяцей на некалькі падгруп. Кожнай падгрупе даецца канверт, у якім знаходзяцца разрэзаныя выявы

прыроднага сімвала Беларусі (зубр, бусел, сасна, кветкі лёну, канюшыны, васілька).

- Дзеці, а ці любіце вы загадкі? Добра. Загадкі вучаць думаць, развіваюць кемлівасць, фантазію. Давайце паспрабуем адгадаць:

Ляжыць сярод градкі зялёны і гладкі. *(Агурок)*

Каляровае карамысла цераз рэчку павісла. *(Вяселка).*

Урадзіўся ён высокі, шаўкавісты, сінявокі,
Апранае нас здавён…Здагадайцеся, хто ён?
(лён)

Цвіту ўсё лета я. Жыву звычайна ў жыце.
Нашу хлапечае імя. Як зваць мяне, скажыце? (васілёк)

Не рыба, а плывец, не конь, а ходзіць, не піла, а рэжа. (Бабёр.)

Белы, як снег, салодкі, як мёд. *(Цукар)*

Славен край наш беларускі ёй здаўна.
Частка розных страў яна.
І зімой, і летнім часам
На яе мы вельмі ласы. (Бульба.)

Выхавальнік: Дзеці, якія вы малайцы! Я спадзяюся, што наш занятак закрануў вашы сэрцы, выклікаў пачуцце гордасці за нашу краіну, вельмі важна любіць сваю сям'ю, сваю родную вёску, сябраваць з аднагодкамі, ганарыцца сваёй Радзімай, у тым ліку і яе дзяржаўнымі сімваламі.